Зацвярджаю
Начальнік аддзела адукацыі,
спорту і турызму
І.В. Асташэвіч
"  " кастрычніка 2017 г.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2017/2018 навучальны год**
**Комплексная работа**
**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Якія гукі абазначаюць падкрэсленыя літары? Запішыце гукі ў квадратныя дужкі.**

1) бяро**зк**а [ ]; 2) му**ндз**ір [ ]; 3) перабе**жч**ык [ ]; 4) каўка**зс**кі [ ]; 5) **не** ведалі [ ]; 6) супра**цьд**ымны [ ]; 7) хрэ**сьб**іны [ ]; 8) спар**тс**мен [ ].

*Максімальная колькасць балаў – 4*

.

**Заданне 2. Запішыце, з якім значэннем ужываюцца прыведзеныя ўстойлівыя выразы ў сучаснай моўнай практыцы.**

| | |
|---|---|
| Сіняя птушка | |
| Сляпое кацяня | |
| Стрэляная птушка | |
| Страляць з гарматы па вераб'ях | |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 3. Перакладзіце рускамоўныя словазлучэнні на беларускую мову такім чынам, каб дзеясловы ў беларускамоўных адпаведніках не паўтараліся.**

Устроить встречу - ______________________________________________;

устроить свадьбу - __________________________________________________;

устроить скандал - __________________________________________________;

устроить семейную жизнь - ______________________________________;

устроить комнату - ___________________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 4. Разбярыце словы па саставу.**

Жыць, жылец, абязводжаны, недасаліць, здзіўляцца, прачытаў, здавалася, безумоўна, пішучы, прыслоўе.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 5. Выпішыце са сказаў: 1) словы, у якіх прапушчана літара а 2) словы, у якіх прапушчана літара ы 3) словы, у якіх прапушчана літара э.**

1) Матчына хата ў змр...ку др...мотным. В...кны распятыя. Голыя сц...ны. І правадоў уч...рнелыя вены п...ўняцца цішай, як токам гр...мотным. *(Р. Барадулін)* 2) Таму ўжо будзе, мусіць, год, вуч...бную стр...льбу праходзіла п...хота. *(К Крапіва)* 3) Гарачы м...довы вод...р ідзе з раніцы, поўнай сцішанага звону. *(Л. Левановіч)* 4) Народ, зямля, радзіма - за іх св...ты пр...стыж, за гэта тр...адзінства дз...ды ішлі - на крыж. *(М. Маляўка)* 5) Сярод паэтаў, ар..штаваных па сфабрык...ванай справе Саюза вызвалення Беларусі, быў і Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка. Орд...р на яго ар...шт дз..вятнаццатага ліп..ня тыс..ча дз...вяцьсот трыццатага г..да падпісаў намеснік старшыні АДПУ СССР вядомы Гірш Ягада. (У. *Міхлюк)*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

**Заданне 6. Выпішыце канструкцыі, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:**

Па-юнацку бадзёра, лататы даваць, рыхтавацца да алімпіяды, уздоўж лесу, горад Мінск, бадай поўны, іскрысты снег, менш падрабязна, паварот направа, сорак два, адказваць на пытанні, дзень марозны, пайшлі адпачываць, жменя ягад.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 7. Складзіце са слоў два варыянты сказаў, у якіх прыметнікавы зварот адасабляецца і стаіць: 1) перад азначаемым словам; 2) пасля азначаемага слова.**

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Бярозы, купчастыя, лясы, песціла, сінявокая, цеплыні, і, ласкі, далёкія, і, поўная, смуга.

**1.**

**2.**

**Заданне 8. Запоўніце пустыя клеткі ў табліцы.**

| № | Пісьменнік | Месца нараджэння |
|---|---|---|
| 1. | Ф. Скарына | |
| 2. | | фальварак Вязынка |
| 3. | | вёска Акінчыцы |
| 4. | М. Багдановіч | |
| 5. | У. Караткевіч | |
| 6. | | вёска Бычкі |

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

**Заданне 9. Запоўніце табліцу.**

| Назва твора | Жанр | Аўтар |
|---|---|---|
| “Слуцкія ткачыхі” | | |
| “Магіла льва” | | |
| “Ганарысты парсюк” | | |
| “Паром на бурнай рацэ” | | |

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 10. Пазнайце літаратурных герояў. Назавіце твор і аўтара.**

“Старшына ________________ раўнадушна пацiснуў яе (руку), стрымана паціснуў халодную камбатаву далонь і “вучоны” – у акулярах, высокі, сутулы баец __________________; без крыўды, шчыра зірнуў на камандзіра другі няўдака, на якога скардзіўся старшына, - малады, са свежымі сумнымі вачыма радавы _______________.” “Нічога, чорт не здрадзіць – свіння не з’есць, - бесклапотна пажартаваў пэтээравец __________________ белабрысы, расшпілены на ўсе кручкі і гузікі, жулікаваты з выгляду хлопец. Спаважна падаў сваю пухлую далонь непаваротлівы, мардаты ___________________ і пачціва, прыстукнуўшы бруднымі абцасамі, развітаўся чарнявы, прыгожы ______________________________”.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

_______________________________________________________________

_______________________________________________________________

_______________________________________________________________